ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1988 ЧАЦВЕР 15 СНЕЖНЯ № 34(1592)

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

У наступным нумары чытайце:

●●●

Няшмат часу засталося да таго дня, калі мы будзем адзначаць 70-годдзе ўтварэння БССР і Камуністычнай партыі Беларусі. І як звычайна, перад любой знамянальнай падзеяй, мы аглядваемся назад, аналізуем зробленае, падводзім вынікі, намячаем планы на будучае. Нешта нас радуе, нешта незадавальняе, штосьці зрабілі б зусім паіншаму. Але, у цэлым, прыемна ўсведамляць, што ў летапісу працоўных дасягненняў рэспублікі ёсць і наш важкі працоўны радок.

Як пісаўся ён?

Часам нялёгка, супярэчліва, складана. Аб гэтым і разважаюць аўтары матэрыялаў, прысвечаных 70-годдзю БССР і КПБ, якія вы зможаце прачытаць у спецвыпуску да гэтай юбілейнай даты, змешчаным у наступным нумары газеты.

## ЗВАРОТ

### да студэнтаў, прафесарска-выкладчыцкага саставу і супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

Дарагія таварышы! Сёння адна з братніх саюзных рэспублік нашай шматнацыянальнай краіны — Армянская ССР падверглася страшэннаму разбуральнаму ўздзеянню стыхіі. У выніку землетрасення загінулі многія тысячы людзей, дзесяткі тысяч атрымалі траўмы, для лячэння якіх і выратавання іх жыцця неабходны значныя намаганні медыцынскіх работнікаў і ўклад матэрыяльных сродкаў.

Разбурэнне жылых будынкаў, вытворчых, медыцынскіх і іншых збудаванняў прывяло да таго, што значная частка насельніцтва рэспублікі засталася без жылля і сродкаў для існавання.

Мы ўпэўнены, што армянскі народ не застанецца без увагі, і яму будзе аказана ўся неабходная дапамога па ліквідацыі вынікаў стыхіі і жыццезабеспячэнню пацярпеўшага насельніцтва.

Выказваючы спачуванне сем'ям загінуўшых і пацярпеўшых, мы заклікаем вас у гэтыя цяжкія для армянскага народа дні актыўна ўключыцца ў збор сродкаў на аказанне гэтай дапамогі.

РЭКТАРАТ
ПАРТЫЙНЫ КАМІТЭТ
ПРАФСАЮЗНЫ КАМІТЭТ
СТУДЭНТАЎ І СУПРАЦОЎНІКАЎ
КАМІТЭТ КАМСАМОЛА
КАМІТЭТ ТАВАРЫСТВА
ЧЫРВОНАГА КРЫЖА

## ФОТА Ў НУМАР



Святлана ДАРАСІНСКАЯ (на здымку) узначальвае камсамольскае бюро кафедры матзабеспячэння ЭВМ факультэта прыкладной матэматыкі. Святлана — выдатніца вучобы, але і з камсамольскімі клопатамі ёсць час спраўляцца. Як і належыць лідэру, яна заўсёды сярод людзей: і ў час вучобы, і ў будатрадзе, і на вечарах адпачынку.

Фота С. ГРЫЦА.

## Беларускі універсітэт ТЭЛЕТАЙП

*ВЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### НЕ ТОЛЬКІ ВУЧОБА

ў полі зроку дэканата па рабоце з замежнымі навучэнцамі. Хоць гэта лічаць тут, безумоўна, галоўным, не забываюць і на адпачынак.

— Студэнт-замежнік павінен везці да сябе на радзіму самыя цёплыя і прыемныя ўспаміны аб нашай краіне,— гаворыць намеснік дэкана В. С. Клімовіч.— І таму кожны раз пры складанні плана мерапрыемстваў на месяц мы стараемся, каб нашы сябры мелі магчымасць пазнаёміцца з гісторыяй, культурай, звычкамі, традыцыямі савецкага народа. Праводзім вечары адпачынку, сустрэчы, конкурсы, арганізуем паездкі па памятных мясцінах і г.д.

Трэба сказаць, што замежныя студэнты з ахвотай ідуць на такія мерапрыемствы. Бо акрамя цікавага правядзення часу тут яны знаходзяць і новых сяброў сярод савецкіх студэнтаў. Заўважу, што такі план мы вывешваем загадзя, каб тыя, хто зацікавіцца ім, змаглі спланаваць свой час і прыйсці на сустрэчу. З планам мерапрыемстваў на гэты месяц вы можаце пазнаёміцца на трэцім паверсе галоўнага корпуса ля дэканата па рабоце з замежнымі студэнтамі.

З. МІХНЕВІЧ.

### ЯК ЗРАБІЦЬ ВЕЧАРЫ ЦІКАВЫМІ?

Безумоўна, многія з вас не раз задумваліся над гэтым. І прыходзілі да вываду, што стандартныя вечары і дыскатэкі ўсім надакучылі. Патрэбна разнастайнасць і нейкая «ізюмінка», якая б прыцягнула ўвагу. «А што, калі паспрабаваць выкарыстоўваць пласцінкі?» — раптам здагадваліся вы. Толькі дзе іх узяць? І ў гэтым дапаможа вам... аддзел масавай работы бібліятэкі. Дарэчы, нядаўна фонд грампласцінак папоўніўся новымі запісамі класічнай і сучаснай музыкі.

М. АНДРЭЕЎ.

### ЗАХАПЛЯЮЧЫЯ ПАЯДЫНКІ

барцоў класічнага стылю выклікалі бурную рэакцыю балельшчыкаў. Асабліва хваляваліся яны, калі на дыване былі І. Судакоў і Ф. Агаеў. Апошні не хацеў уступаць кандыдату ў майстры спорту. Але Ігар аказаўся мацнейшым і з лікам 15:11 Судакоў выйграў (у вагавой катэгорыі 57 кг ).

Не менш напружанымі былі і схваткі паміж астатнімі ўдзельнікамі першынства універсітэта па класічнай барацьбе. Назавём імёны пераможцаў: Я. Агаеў (вагавая катэгорыя 52 кг) — гістфак, У. Кунцэвіч (62 кг) — геафак, А. Казлоўскі (68 кг) — факультэт радыёфізікі і электронікі, А. Грынцэвіч (74 кг) — геафак, В. Субач (82 кг) — фізфак, А. Суша (90 кг) — хімфак, С. Хрыпач (100 кг) і С. Шаліма (звыш 100 кг) — юрфак.

У агульнакамандным заліку першыя тры месцы занялі адпаведна юрыдычны, геаграфічны, фізічны факультэты.

В. РУДЗЯНКОЎ.

---

Памеры разгулу бяды на тэрыторыі невялікай Арменіі здаюцца неверагоднымі.
Бязлітаснасць безаблічнай стыхіі ашаламляе. А людзі павінны заставацца людзьмі.
І жыць па законах спачування і міласэрнасці.
Не азіраючыся, не перастрахоўваючыся, не падлічваючы.
Чым канкрэтна можам дапамагчы мы?
Крывёю. Шаснаццаць донараў пра даведку аб вызваленні ад заняткаў не думалі — толькі б не спазнілася жыватворная вадкасць на дапамогу.
Грашыма. Стыпендыя ў студэнткі 2-га курса Ганны Ліфман самая звычайная — сорак рублёў. Таму на рахунак № 700412 пералічыла не сотню — пяць рублёў. Колькі змагла.
Цёплымі рэчамі. Іх многа. Клапатліва складзеных, акуратна запакаваных.
Частка ўжо адпраўлена ў Арменію. Прыносяць яшчэ і яшчэ.
Працай на разборцы руін і завалаў, аднаўленні будынкаў. Муляр, плотнік, вадзіцель, бетоншчык, бульдазерыст, тынкоўшчык, зваршчык... Трыццаць добраахвотнікаў. У камітэце камсамола — яшчэ каля 150 заяў...

## Універсітэт прыйшоў на дапамогу

Дзяўчынка нясмела зайшла ў пакой услед за маці і здзіўлена агледзела пакункі з цёплым адзеннем, што ляжалі на крэслах і на падлозе. Потым яшчэ раз пагладзіла пушыстага Мішку, якога ўвесь час пяшчотна туліла да сэрца, з якім, напэўна, кожны вечар разам засынала пад матуліну калыханку, і рашуча паклала цацку ў пакунак. І ні шкадавання, ні тугі ўжо не было ў вачах малой, было не падзіцячаму сур'ёзнае разуменне, адчуванне ўсеагульнай бяды, што знянацку звалілася на людзей. Вера Акімаўна Прокашава, намеснік сакратара парткома па арганізацыйнай рабоце, нават імя дзіцяці не паспела спытаць, бо раптам прыйшлі два супрацоўнікі універсітэта, таксама прынеслі рэчы для армянскіх сяброў: «На жаль, прозвішча ніхто не хоча называць, ды й тыя, каго ведаеш, просяць не афішыраваць — гэта ж не на паказуху, гора агульнанароднае, людзям патрэбна дапамагчы. Некаторыя купляюць у магазіне коўдры, бялізну, абутак і прыносяць для адпраўкі пацярпеўшым. Нават кнігі, сшыткі, пісьмовыя прыналежнасці нехта здагадаўся пакласці разам з адзеннем».

Зараз кабінет Веры Акімаўныператварыўся ў сапраўдны штаб. Людзі ідуць сюды не толькі з рэчамі. Ідуць з прапановамі — шмат жадаючых даць прытулак тым, хто страціў жыллё ў час стыхіі.

— Нядаўна заходзіла Ірына Вікенцьеўна Шаблоўская — загадчыца кафедры замежнай літаратуры філфака,— расказвае Вера Акімаўна,— прасіла, калі прыбудуць пацярпеўшыя з раёнаў бедства, адразу ж паведаміць ці накіраваць да яе дамоў. Спіс такіх людзей ужо даволі змястоўны і папаўняецца на вачах.

— Адчувальна і грашовая дапамога студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. Амаль праз кожную гадзіну ў прафком ідуць звесткі аб грашовай дапамозе. НДІ ФХП, напрыклад, пералічыў на рахунак № 700412 10 тысяч рублёў, а літаральна за апошні час паступіла яшчэ 3620 рублёў ад супрацоўнікаў універсітэта,— дапаўняе старшыня прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў В. М. Анішчык.

М. ДЗЯБЕЛА.

## Каб вырас новы горад

У ІНШЫ ЧАС, у мяне няма сумнення, першым бы абурыўся ён, намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта па працоўнаму выхаванню Васіль Бойка: «Без падрыхтоўчага перыяду?!» і рашуча адмовіў бы атраду ў выездзе на месца дыслакацыі.

У іншы час спатрэбіліся б, магчыма, тлумачэнні, агітацыя і ўгаворы.

— І я паспеў запісацца дваццаць другім,— Валера Гайдучонак узрушаны. Учора ў дванаццаць ён быў залічаны байцом універсітэцкага атрада. Сёння, 10 снежня, у шэсць гадзін раніцы, ідуць апошнія прыгатаванні да ад'езду ў Арменію.

— Гена, хутчэй. Медыкаменты,— адрывіста і сурова атрымліваецца ў камандзіра Васіля Бойкі. (Эканоміць секунды на словах).

— Адрас... Які адрас? — не адразу разумее маю просьбу Юра Дыро. (Галоўнае зараз — не забыць прыгатаваныя загадзя чаранкі для рыдлёвак).

І Сяргей Мельгуй, расказваючы пра будатрадаўскі стаж і вопыт работы майстра вытворчага навучання, прадстаўляючы як самага малодшага (другакурсніка юрфака) Мішу Стральцова, не адрывае вачэй ад рукзака. Я цярпліва чакаю, пакуль міне незапланаваная паўза — нешта не ідзе на лад там з гэтымі лямкамі.

А потым некуды губляюцца літары знаёмай клавіятуры пішучай машынкі — разам з Сяргеем Калядой друкуем чарговую неабходную паперу.

Большая частка байцоў атрада вучыцца на юрфаку: Уладзімір Лубешка, Сяргей Буканаў, Аляксандр Сухаверка, Уладзімір Емяльянаў, Андрэй Ермалінскі, Аляксандр Лашын, Сяргей Рак, Дзмітрый Шаўлюкевіч, Генадзь Канаш, Аляксандр Драздоў, Эдуард Сапега, Юрый Ламека, Алег Краўцоў. Побач з Артурам Акапянам і Арсенам Мелікянам, для якіх атрад — магчымасць дапамагчы роднай Арменіі, будуць працаваць іх сябры з гістарычнага факультэта: Андрэй Пастухоў, Юрый Каштанаў, Васіль Мацюшэўскі, Валянцін Канавалаў, Ях'ё Дадакузіеў і студэнт фізічнага факультэта Юрый Марціновіч.

...Па пратаптанай сцежцы да падземнага пераходу і вагонаў цягніка ідуць яны першымі са студэнтаў Беларусі. Апошнім усміхнецца праз зачыненае вакно камісар Саша Канаш. Два тыдні назад ён стаў членам КПСС. Нават атрымаць партыйны білет не паспеў — паехаў дапамагаць у бядзе, весці выратавальныя работы, насуперак стыхіі будаваць новы горад.

З. МАРАВА.



ПУНКТ ПЕРАЛІВАННЯ КРЫВІ

# Не дзеля падзякі



Падлогу памылі, парты паставілі па-новаму — у гэтай аўдыторыі зараз з'явіцца група медыкаў з Інстытута пералівання крыві. Яна спазнілася на гадзіну, але на першым паверсе, у канцы калідора, дачакаліся. Незвычайная тут стаяла чарга. Маладыя людзі цярпліва чакалі, каб аддаць частачку сваёй крыві,— можа, і зменшыць яна тыя страшэнныя пакуты...

— Дзяўчаты, вам патрэбна даведка аб вызваленні ад заняткаў?

— Мне — не. Я жыву ў Жодзіне і магу ездзіць дамоў кожны дзень,— трошкі абураецца пытаннем студэнтка 3-га курса філалагічнага факультэта.

Прадстаўніца 2-га курса геафака згодна з ёй:

— Я таксама не за даведкай сюды прыйшла — хачу дапамагчы. Кроў буду здаваць упершыню. Не, не баюся! Мне б яшчэ даведацца, калі паедзе ў Арменію універсітэцкі атрад. Хачу быць яго байцом — мама мне ўжо дазволіла ехаць туды. Але я чула, што дзяўчат не бяруць...

— А я з 1-га курса ФПМ. Таксама першы раз здаю кроў. Мяне завуць Валодзя...

Хлопец назваў і прозвішча, але адразу пашкадаваў аб гэтым:

— Навошта называць у газеце? Не, не трэба.

За першую гадзіну кроў здалі трыццаць чалавек. І, здавалася, чарга яшчэ доўга будзе мнагалюднай. Але... У 18 гадзін натоўпу ўжо не было, і хутка медыкі паставілі ў спецыяльную каробку апошнюю, восемдзесят трэцюю, шклянку з крывёю студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ.

Нейкія супрацьлеглыя пачуцці ахопліваюць, калі спрабуеш ацаніць гэты вынік. Вось і Леанард



Аляксандравіч Фралоў, старшыня камітэта Таварыства Чырвонага Крыжа БДУ, гаворыць, што хочацца бясконца выказваць падзяку кожнаму, хто прыйшоў 9 снежня падзяліцца сваёй крывёй. Але ж чакаў ён, Леанард Аляксандравіч, большай колькасці такіх людзей, калі напярэдадні, яшчэ да аб'явы аб здачы крыві для Арменіі, адказваў па тэлефоне на адно і тое ж пытанне з розных факультэтаў: «Чым дапамагчы?»

І яшчэ адзін засмучальны факт: тую ж брыгаду медыкаў, што прыехала да нас, запрашалі на адно прамысловае прадпрыемства, дзе донараў было не менш чым 200. Але выбралі нас. Спадзяваліся, што студэнты прышлюць значна больш донараў, чым 1% ад сваёй колькасці, і выкладчыкаў і супрацоўнікаў таксама знойдзецца больш, чым сямёра...

Універсітэцкі Дзень донара ў апошні час праходзіць беспаспяхова, напрыклад, у кастрычніку гэтага года кроў здалі толькі 192 чалавекі. Мабыць, ёсць ў гэтай з'явы нейкія сур'ёзныя прычыны. Але ж 9 снежня выпадак быў асобы... В. БЯГУН, студэнтка факультэта журналістыкі.

Фота С. ГРЫЦА.



НАМ ПІШУЦЬ

## ПРАЦУЕ СЕМІНАР

Вы заўважылі, як рушацца апошнім часам традыцыйныя каноны? Замест сухіх, акадэмічных, вытрыманых у строгіх рамках лекцый і аўтарскіх прамоў прыходзяць новыя, «раскутыя» па стылю «жывыя» гутаркі-развагі па актуальных праблемах той ці іншай галіны пазнанняў. Змяняюцца, урэшце, і адносіны лектара і слухача. З пасіўнага аб'екта навучання студэнт ператвараецца ў зацікаўленага субяседніка, калегу па сумеснай працы, творчага, думаючага партнёра.

Усё больш рашуча і смела высвечваюцца «белыя плямы» нашай гісторыі.

Мы з цікавасцю сочым за тым, што публікуецца ў друку. З нечым згаджаемся, здараецца, не. І гэта заканамерна ва ўмовах плюралізму думак і меркаванняў. Пра гэта ж чытаюць і нашы студэнты. Як разумеюць яны гэтыя пытанні, нярэдка супярэчлівыя, неадназначныя? Часам выкладчыкі абыходзяць іх: маўляў, не значацца ў праграме. А студэнт застаецца сам-насам са сваімі думкамі і перакананнямі.

Тут мы ўшчыльную сутыкаемся з рабочымі планамі і праграмамі, у якіх не заўсёды яшчэ ўлічаны свежыя павевы гісторыі. Ці не засталіся мы са сваім базісам на ўзроўні мінулых гадоў?

Пытанні гэтыя, вельмі хвалюючыя, былі асноўнымі на першым (з чатырох запланаваных) метадычным семінары, куды былі запрошаны выкладчыкі журналісцкіх дысцыплін, журналісты-гісторыкі, журналісты-практыкі. На ім выступілі: загадчыкі кафедраў факультэта Б. В. Стральцоў, Я. Р. Радкевіч, І. І. Сачанка, дацэнт кафедры гісторыі журналістыкі С. В. Говін, выкладчыца гісторыі БССР А. І. Конанава. У рабоце семінара прыняў удзел дэкан факультэта А. Г. Слука.

Шматлікія праблемы і тэарэтычныя, і метадычнага характару паўстаюць перад выкладчыкамі. Нікому не навязваю сваю думку, але спадзяюся, што падобныя семінары — адна з форм, якая дазваляе нам абменьвацца вопытам, спрачацца, вырашаць праблемы.

А. НАРКЕВІЧ, старшыня метадычнай камісіі факультэта журналістыкі.

## Такім не застанецца

Ён працягвае існаваць. І ў студэнтаў застаецца толькі дзве магчымасці атрымліваць дакладную інфармацыю: лекцыя выкладчыка і перыядычны друк. За акадэмічную гадзіну дасканала выкласці тэму немагчыма. Прагледзець, не тое каб прачытаць, усё таксама неверагодна. А ведаць трэба. Іменна ў гэтым без дапамогі падручніка не абысціся. Ды дзе там! «Курс лекцый па гісторыі КПСС» даўно састарэў.

Што не падабаецца ў «Курсе...»? Студэнты II курса 3-й групы педагагічнага аддзялення механіка-матэматычнага факультэта сышліся ў адным: «амаль усё не падабаецца і не задавальняе». У якасці асноўнага абвінавачвання вылучылі лозунг: «Падручнік не павінен навязваць якую б ні было пазіцыю».

А вось пажаданні, выказаныя да новага, які яшчэ не напісаны. Падручнік павінен: «быць праўдзівым, сціслым, зразумелым, без сухіх і бессэнсоўных фраз», «выкладаць факты без навязвання пазіцыі», «даваць аб'ектыўную ацэнку гістарычным з'явам».

Знайшліся і тыя, хто засумняваўся. У тым, што новы падручнік не будзе, як дзве кроплі вады...

Трэба дадаць, што на пасяджэнні камісіі ЦК КПСС па падрыхтоўцы «Нарысаў гісторыі КПСС» (яны і будуць арыенцірам для стварэння новых падручнікаў) сярод важнейшых патрабаванняў вылучаліся праўдзівы паказ працэсу станаўлення і дзейнасці партыі на ўсіх этапах яе гісторыі, сумленны аналіз прычын дэфармацыі і адступленняў.

Пажаданні не супярэчаць патрабаванням... У выніку — новы падручнік будзе сапраўдным памочнікам для студэнтаў.

Л. АНТУХ.

## «ВАША КНІГА ПАТРЭБНА ІНШЫМ!»

*МЫ ЎЖО не ведаем, якія меры прымаць. Не ўздзейнічаюць ніякія. Людзі не прыслухоўваюцца ні да нашых просьбаў, ні да папярэджанняў. Магчыма, дапаможа гэты ліст у рэдакцыю? Некаторыя мае калегі, прачытаўшы яго, з выглядам людзей, страціўшых усялякую надзею што-небудзь змяніць, задавалі рытарычнае пытанне: «На што ты спадзяешся?» На свядомасць людзей. У каго-небудзь яна ўсё ж такі павінна прачнуцца. А калі не? Тады абавязкова патрэбна, як кажуць, нешта рабіць.*

*Толькі з чаго пачынаць удасканаленне сістэмы абслугоўвання бібліятэкі? Прыбраць з паліц літаратуру для свабоднага доступу? Правяраць кожную старонку перад выдачай і здачай? Тады наўрад ці дасягнем мы паляпшэння. Хутчэй наадварот. Зрабіць нешта накшталт прахадной з рэнтгенаўскім апаратам? На гэта патрэбна нямала сродкаў і, галоўнае, так мы можам пакрыўдзіць сумленных наведвальнікаў, падазраючы ў кожным з іх «несуна».*

*А такіх, хто праўдай і няпраўдай стараецца вынесці з чытальнай залы ўсё, што ім патрэбна, на жаль, хапае. Як прыкра становіцца на душы, калі пасля работы, гартаючы літаратуру, якой карысталіся нашы наведвальнікі, бачыш усё новыя і новыя выдраныя старонкі, выразаныя артыкулы, а то і наогул пустыя месцы на кніжных паліцах.*

*Абанемент навуковай і мастацкай літаратуры, чытальную залу для прафесарска-выкладчыцкага саставу наведваюць студэнты ўсіх факультэтаў, выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта. І як карціць часам ім сказаць: «Спыніцеся, адумайцеся! Пасля вас прыйдуць сюды іншыя чытачы. Магчыма, сярод іх акажуцца вашы дзеці. Ці не сорамна будзе вам, калі замест неабходнага артыкула яны ўбачаць... дзірку?»*



*Але не толькі з-за «рвачоў» у нас непрыемнасці. Сярод чытачоў абанемента шмат такіх, хто прывык лічыць бібліятэчную кнігу сваёй уласнасцю. Бо яна, па сутнасці, перайшла ў калекцыю асабістую. І мала шансаў, што калі-небудзь вернецца туды, дзе павінна быць. Хочацца запытаць, ці збіраюцца зрабіць такі «высакародны ўчынак» даўнішнія выпускнікі аспірантуры В. В. Балтрамеюк, Е. А. Кляцкова, В. В. Трамбіцкі, В. С. Адамчык, С. В. Палішчук і іншыя. Бяруць прыклад са старэйшых і тыя, хто закончылі аспірантуру ў гэтым годзе і таксама забыў вярнуць бібліятэцы ўзятыя кнігі. Гэта Т. Н. Цімошчанка, Е. А. Камоцкая, А. М. Вешторт, В. С. Івашко...*

*Нямала забыўчывых і сярод студэнтаў. Не буду называць іх прозвішчы, бо чытачы і так, напэўна, стаміліся. Кожны ведае свае запазычанасці сам. І неяк няёмка зноў усім напамінаць:*

*— Ваша кніга патрэбна іншым!*

*Ф. МІРУШЧАНКА, старшы бібліятэкар.*



## ДАПАМОЖА ТАНЯ ДЗЕВЕР

# Калі пошукі не ў цяжар

КАЛІ набліжаюцца летнія канікулы, большасць студэнтаў заклапочаны тым, што хутка ім патрэбна будзе займацца вельмі складанай і непрыемнай справай — пошукамі часовай работы на лета.

Але гэты працэс можа і не быць такім цяжкім. Таня Дзевер, адміністратар праграмы «Работа для студэнтаў» у Калгары, прапануе наступнае: студэнты павінны дакладна ведаць, што яны хачуць, і загадзя высветліць, дзе ёсць вакантныя месцы. Тады іх пошукі будуць паспяховымі.

Дзевер лічыць, што студэнты павінны прааналізаваць свае здольнасці, інтарэсы, веды, майстэрства, улічваючы ўсё, чаго дасягнуў на рабоце, курсах, праз штодзённы жыццёвы вопыт. Тады адразу будзе відно, якая работа ім больш падыходзіць.

Другі крок — даведацца аб наяўнасці свабодных месц. Большасць студэнтаў знаходзяць работу па аб'явах, праз асабістыя кантакты ці звяртаючыся прама да работадаўцы.

Пра некаторыя (хоць і не пра ўсе) вакантныя месцы студэнты даведваюцца з газетных аб'яў, а таксама ў цэнтрах па найму, такіх, як «Работа для студэнтаў». Выкарыстоўваць асабістыя кантакты — значыць, гаварыць усім і кожнаму, што табе патрэбна работа. Галоўнае, не забыць пры гэтым паведаміць дэталі: якую работу ты шукаеш і чаму зможаш яе выконваць. Рэкамендуецца быць у курсе, якія плануюцца службовыя перастаноўкі, дзе адкрываюцца новыя рабочыя месцы і новыя філіялы прадпрыемстваў. Да работадаўцаў студэнты звяртаюцца асабіста ці па тэлефоне. Карыстаючыся тэлефонам, можна «дастаць» многіх, але затое пры асабістых зносінах можна быць пераканаmaking, што цябе запомняць.

Часта назва пасады нічога не гаворыць студэнту пра спецыфіку работы і яго абавязкі. Таму Таня Дзевер раіць задаваць пытанні і шукаць адказы ў спецыяльнай літаратуры фірмы, у якую ты паступаеш на работу, ці ў яе супрацоўнікаў. Яшчэ лепш — самому пабываць на месцы будучай работы.

Хаця кожны студэнт і кожная работа па-свойму ўнікальныя, усе гэтыя прыгатаванні значна аблегчаць нялёгкія пошукі работы і прынясуць удачу.

КОННІ ГІБСАН,
кар. газеты «Gauntlet»
(для «Беларускага універсітэта»).

## ТЫДЗЕНЬ ДА СТЫПЕНДЫІ

# Дзе ўзяць грошы?

**ці ШТО РАБІЦЬ?**
**ці УНІЖАНЫЯ І ЗНЯВАЖАНЫЯ**
**ці БЕДНЫЯ ЛЮДЗІ**
**Карацей, ЗАПІСКІ Ў ЦЯЖКІ ЧАС (гл. рубрыку)**

*Умова: студэнт — такі ж грамадзянін, як і астатнія. Яму патрэбны грошы на харчаванне, прыгожае адзенне, цікавы адпачынак.*

*Пытанне вынесена ў загаловак.*

*Рашэнне мае некалькі варыянтаў.*

ВАРЫЯНТ ПЕРШЫ. Калі вы збіраецеся наведаць родных і блізкіх, асабліва бабуль і цётак, не забудзьцеся прыхапіць недарагі, але арыгінальны падарунак. Не забудзьцеся пры сустрэчы пацалаваць дарагога сваяка ў шчаку і некалькі разоў перапытаць пра здароўе. Размаўляйце спакойна, слухайце ўважліва, глядзіце любасным поглядам. Да канца сустрэчы сума вам ужо гарантавана. Паспрабуйце за адну паездку наведаць некалькіх сваякоў.

ВАРЫЯНТ ДРУГІ. Стыпендыя і матэрыяльная дапамога «імем прафкома». Вучыцца трэба старанна: добрая вучоба (удалая здача сесіі) забяспечыць стыпендыю.

Матэрыяльная дапамога — справа тонкая. Усталюйце добрыя адносіны са старшынёй прафкома. Пазычце ў яго пэўную суму. Не вяртайце яе ў тэрмін. Пакрысе падвядзіце вашага сябра да думкі пра матэрыяльную дапамогу. Збіраючы подпісы групоргаў і іншых, не ўздумайце надзець «варанку» ці фінскія боты. Дзяўчатам рэкамендую часова перайсці з французскай парфумы на духі «Чырвоная Масква».

ВАРЫЯНТ ТРЭЦІ. Спачатку (там вы нічога не знойдзеце, але...) звярніцеся ў бюро па працаўладкаванню (вул. Свярдлова, насупраць інтэрната № 1). Я таксама, дарэчы, шукаў, стараўся, але...

Чаму «але»? Амерыканец Джо, які едзе з Чыкага ў Нью-Йорк у пошуках працы і фартуны, мае больш шансаў, чым вы: у яго не патрабуюць пашпарт (У ЗША іх няма), а прапануюць серыю тэстаў для вывучэння прафесійных здольнасцей. У вас жа спярша запытаюць, ці маеце вы мінскую прапіску. Ах, вы яшчэ і студэнт?! (У гэты момант звычайна звоніць тэлефон). Ну што ж... Ёсць месцы: МТЗ, МАЗ. Так, у начную змену. 250—300.

Але хопіць ілюзій. Варта вам трапіць у цэх, усвядоміце, што розніца паміж разумовай і фізічнай працай жыве і будзе жыць яшчэ доўга.

Наступны этап — хлебазавод. Вазьміце даведкі, што вы здаровы і што вы студэнт. Вольных месц, зразумела, няма. Але хутка будуць. Так, у начную. Так, 10 за ноч. Так, дні праз тры заходзьце.

Праз тыдзень вы атрымаеце старое, але чыстае белае спецадзенне, а інструктар па ТБ раскажа, што завод мае багатыя працоўныя традыцыі, пабудаваны яшчэ да вайны, таму будзьце ўважлівымі: траўматызм высокі.

Раніцай адзенне стане шэрым і мокрым. На лекцыях будуць сніцца батоны. Шмат батонаў. Бясконцая рака батонаў, якая цячэ проста на вас, а вы не паспяваеце скіроўваць яе ў латкі. Апечаныя пальцы будуць балець нават у сне.

Апошні этап — начны вартаўнік ці дворнік. Позна. Няма месц. Трэба было з лета шукаць: больш вопытныя студэнты час не гублялі. Усё ж — пахадзіце, пазваніце. А раптам...

ЗАЎВАГА. Калі вырашыце выконваць за грошы кантрольныя работы, чарцяжы ці працаваць лабарантам, забяжыце ў аптэку за таблеткамі ад галоўнага болю. Не, заробленая сума будзе большай за іх кошт.

Што ж, чакай лета. Адпачывай, дружа!

А. ШВАРЦ.




## ПАКУЛЬ ДУМАЕМ...

# «Кааператыў на ўсе рукі»

**СТУДЭНТЫ ставяць пытанні, просяць парады, дзеляцца вопытам — на жаль, не станоўчым. Існуючыя магчымасці зарабіць, здаецца, мала каго задавальняюць...**

**Што ж прапануе намеснік сакратара камітэта камсамола па працоўнаму выхаванню В. Бойка?**

Да нас з просьбай дапамагчы працаўладкавацца звяртаюцца нячаста. Таму што на гэтым шляху — перашкода ў выглядзе дазволу дэканата працаваць пасля заняткаў. Непераадольная для тых, хто непаспявае. І, зразумела, не атрымлівае стыпендыі.

На наш погляд, трэба ставіцца да гэтага пытання дыялектычна. З аднаго боку, дэканат мае роўнае права кантраляваць «хвасцістаў», з другога — тыя, хто атрымлівае адмову, але не атрымлівае дастатковай колькасці грошай, усё роўна будуць шукаць магчымасці іх зарабіць.

Таму жадаючым прапануем патэлефанаваць на ВА «Мінскбудматэрыялы» (вул. Сярова, 22) па тэлефонах:

78-40-40
78-51-13
78-03-53

Фронт работ — сартыроўка керамічных плітак. Заробак — ад 180 руб. і вышэй, у залежнасці ад выпрацоўкі.

Змены — з 8.00 да 16.00, з 16.00 да 24.00 і з 24.00 да 8.00. Можна афарміцца на стаўку разам з сябрам ці сябрамі.

Пазней думаем стварыць пры камітэце камсамола вялікі студэнцкі цэнтр. Нешта накшталт кааператыву на ўсе рукі, дзе кожны знойдзе занятак па спецыяльнасці.

## ТЫСЯЧА І АДЗІН РЭЦЭПТ

# Пончыкі па-матэматычнаму

...МОЖНА і вартаўніком, і грузчыкам. Толькі — хацелася б па спецыяльнасці.

Студэнты фізфака, матфака і хімфака гэту магчымасць мелі. Два гады працаваў на ВА «Інтэграл» навукова-вытворчы атрад. Работа дапамагала і ў прафесійным станаўленні — яна была непасрэдна звязана з будучай спецыяльнасцю, і матэрыяльна, бо пры рабочым дні ў чатыры гадзіны заробак набліжаўся да сотні рублёў. Жадаючых трапіць у лік двухсот байцоў было шмат. Праўда, і вытрымліваў не кожны, бо на вытворчасці — свае цяжкасці. Але той, хто заставаўся, час работы ў атрадзе страчаным не лічыў.

Год назад, калі аб'яднанне перайшло на гаспадарчы разлік, ад дапамогі студэнтаў яно адмовілася.

Можа, атрад не патрэбны? Тады што кампенсуе працоўныя навыкі? Ды і, як заўважыў загадчык лабараторыі кафедры паўправаднікоў П. В. Жукоўскі, смешна глядзець, як маладыя рабяты — фізікі, матэматыкі, хімікі — гандлююць піражкамі ды пончыкамі.

Павел Віктаравіч, пад чыім кіраўніцтвам быў створаны вытворчы атрад, супрацоўнікі кафедры паўправаднікоў плануюць стварыць у хуткім часе нешта падобнае. Такі ж атрад ці нешта накшталт яго жадаюць бачыць многія. Толькі, на наш погляд, займацца гэтымі пытаннямі павінна не столькі кіраўніцтва кафедры, колькі самі рабяты, штаб працоўных спраў камітэта камсамола.

М. БУРСАК,
Н. ПОЗНІК,
студэнткі факультэта журналістыкі.

## З ТЫХ, КАМУ ПАШАНЦАВАЛА

# Мінус матэрыяльны стымул

ВЕТЛІВАЯ дзяўчына-дыспетчар паведаміла зусім нямногае.

Тым не менш мне ўсё ж удалося што-кольвечы разведаць. У дэканат фізічнага факультэта звяртаецца шмат студэнтаў з просьбай выдаць ім даведку-дазвол для ўладкавання на часовую работу. У асноўным, гэта студэнты старэйшых курсаў, якія вучацца ў другую змену. Большасць працуюць тут жа, ва універсітэце — лабарантамі на розных кафедрах фізічнага факультэта.

Аднак не ўсе атрымліваюць дазвол. Але калі ў вас ёсць падпісаная дэканам даведка, лічыце, што вы ўжо працуеце.

...Люду Баран я знайшла позна вечарам у інтэрнаце. Яна адна з тых шчаслівчыкаў, якія атрымалі запаветны подпіс. Люда і шасцёра яе сяброў працуюць у навукова-даследчым атрадзе ў Інстытуце фізікі цвёрдага цела. Гэтым рабятам пашанцавала: клопаты аб уладкаванні іх на работу ў інстытут узяў на сябе Дзмітрый Аляксеевіч Гарбачэўскі, які курыруе атрад яшчэ з мінулага года. У гэтым годзе атрад на дагаворных умовах працуе ў лабараторыі Інстытута цвёрдага цела і паўправаднікоў Акадэміі навук БССР. У прыватнасці, займаецца звышправоднасцю керамікі. Прычым, працуюць студэнты нараўне з супрацоўнікамі.

Люда рыхтавалася да экзамену, так што размова ў нас атрымалася нядоўгая. Першае маё пытанне, натуральна, пра стыпендыю.

— Я яе атрымліваю, нават павышаную. Так што матэрыяльны стымул адыгрывае тут нязначную ролю.

Пайшла працаваць у атрад хутчэй за ўсё каб лепш пазнаёміцца са сваёй будучай прафесіяй. Хаця можа быць і такое, што пасля размеркавання я траплю на вытворчасць, а не ў лабараторыю. Тут, у інстытуце, я займаюся рэнтгена-структурным аналізам узораў. Работа ў лабараторыі дапамагае ў рабоце над курсавой, на спецыяльных курсах: электрычныя і цеплавыя ўласцівасці цвёрдых цел і асновы рэнтгена-структурнага аналізу.

Маё пытанне аб аплаце работы ў інстытуце таксама было заканамерным.

— У месяц мы атрымліваем па 60 рублёў. Дарэчы, пытанне аб размеркаванні грашовых сродкаў было вырашана на сходзе ўсяго атрада. Так што ніхто не пакрыўджаны.

Здавалася б, на гэтым можна і закончыць. Але не ўсім удаецца так удала сумяшчаць вучобу з работай. Іншым шанцуе менш. Ім трапляе іншая работы, менш прыемная: вартаўнікі, няні, паштальёны, дворнікі...

В. ЗІНОВІЧ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

## ДОШКА АБ'ЯЎ

# РАБОТА... ШУКАЕ СТУДЭНТА

ВАМ ДАПАМОЖА знайсці работу... Новы год. Амаль ці не кожны віншуе родных, блізкіх, знаёмых, сяброў з гэтым святам. Пісьмы, паштоўкі, тэлеграмы ляцяць ва ўсе куткі. У паштовых аддзяленнях толькі паспяваюць з імі «змагацца».

Галоўны і Прычыгуначны паштамты запрашаюць на работу дзяўчат — сартавальніцамі, хлопцаў — грузчыкамі (для пагрузкі і разгрузкі паштовых вагонаў). Вас задавальняе? Тады звярніцеся ў бюро па працаўладкаванню Кастрычніцкага раёна (вул. Жукоўскага, 6) або патэлефануйце туды. Праўда, па тэлефоне работы вы не атрымаеце, а толькі прымеце да ведама інфармацыю аб наяўнасці вакансій.

Але пасля свята неабходнасць у вашых паслугах адпадзе. Дворнікамі і швейцарамі прапануе ўладкавацца Трэст рэстаранаў і кафэ Цэнтральнага раёна г. Мінска. Чакаюць студэнтаў і ў школьных сталовых — пасудамыйкамі і прыбіральшчыцамі.

— Часта патрабуецца рабочая сіла на хлебазаводах, — адказалі на мой тэлефонны званок у Бюро па працаўладкаванню Цэнтральнага раёна (вул. В. Харужай, 42).— Зараз, праўда, заявак адтуль не давалі. Дарэчы, заяўкі мы атрымліваем у панядзелак і сераду. А што датычыць больш кваліфікаванай работы, то вакантныя месцы бываюць рэдка, ды на іх хапае і спецыялістаў.

Карацей, вам будуць рады ва ўсіх бюро па працаўладкаванню і абавязкова пастараюцца дапамагчы. Так што звяртайцеся. Толькі майце на ўвазе: зрабіць гэта можна ў тым раёне, дзе вы прапісаны.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

ДА ЮБІЛЕЮ

*Настаўнік рускай мовы і літаратуры ў пасёлку Капыль. Адначасова выконваючы абавязкі загадчыка аддзела піянерскай работы РК ЛКСМБ. Сакратар райкома камсамола. Інструктар раённага аддзела Фрунзенскага РК ЛКСМБ горада Мінска. Завуч, а потым і дырэктар школы. Начальнік Упраўлення школ і член калегіі Наркамасветы БССР. Першы намеснік народнага камісара асветы Беларусі. Адказны рэдактар навукова-педагагічнага часопіса «Народная асвета». Дырэктар Навукова-даследчага інстытута педагогікі Міністэрства асветы БССР. Працуючы дырэктарам інстытута, падрыхтаваў і паспяхова абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук. У 1954 годзе яму было прысвоена вучонае званне дацэнта. Хутка яго назначаюць першым намеснікам міністра асветы БССР. На гэтай пасадзе працуе каля 17 гадоў. Гэта яшчэ не ўсё пра яго, Сцяпана Андрэевіча Умрэйку.*

# Ён заўсёды быў у пошуку

З 1964 года яго жыццё было звязана з Белдзяржуніверсітэтам. Спачатку ён быў загадчыкам кафедры педагогікі і псіхалогіі. Потым прарэктарам універсітэта па вучэбнай рабоце гуманітарных факультэтаў. Паранейшаму выконваў абавязкі загадчыка кафедры.

Яго арганізатарская і навуковая дзейнасць дасягае тут найбольшых поспехаў, за што яму прысвойваецца званне прафесара, а потым і члена-карэспандэнта АПН БССР. З 1974 года і да апошніх дзён (чэрвень 1978 г.) Сцяпан Андрэевіч быў прафесарам-кансультантам кафедры педагогікі БДУ.

Яго пяру належыць больш ста навуковых работ па самых разнастайных пытаннях дыдактыкі, тэорыі навучання і выхавання навучэнцаў, школазнаўству, па гісторыі асветы.

Прынцыповы і высокакваліфікаваны кіраўнік творчай моладзі, вядомы педагог, Сцяпан Андрэевіч шмат сіл, ведаў і часу аддаваў падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі, справе навучання і выхавання студэнтаў. Ім падрыхтаваны два доктары і 22 кандыдаты педагагічных навук. У 1987 годзе яшчэ тры яго найбольш таленавітыя вучні абаранілі доктарскія і кандыдацкія дысертацыі. Гэта П. Н. Кобрынец, Л. Н. Ціханаў і Р. С. Піёнава.

Педагог, вучоны, кіраўнік народнай адукацыі, для якога праблемы школы былі неаддзельныя ад агульных праблем культуры, ад агульных задач грамадскага развіцця. Думкі яго заўсёды былі ў пошуку, ён заўсёды гатовы быў крытычна перагледзець свае погляды, удакладніць іх, канкрэтызаваць у адпаведнасці з патрэбамі жыцця. Уласцівая яму шырыня думкі, уменне дыялектычна, з марксісцка-ленінскіх пазіцый падысці да вырашэння самых разнастайных праблем вызваляла яго ад аднабокасці. Усё гэта сугучна з задачамі сучаснага перыяду дэмакратызацыі і перабудовы.

Лекцыі і даклады яго часта былі падобныя на шчырую размову, захаплялі слухачоў новымі думкамі, ідэямі, аналізам канкрэтных назіранняў, разважанняў над тым ці іншым фактам. Пры гэтым Сцяпан Андрэевіч умеў вылучаць галоўныя, перадавыя пытанні і тэндэнцыі, характэрныя з'явы, праяўляў партыйны падыход да іх ацэнкі.

Ён клапаціўся не толькі аб тым, каб на рабоце, якой ён кіруе, праводзіліся тэарэтычныя даследаванні актуальных пытанняў педагогікі і псіхалогіі, але і аб сувязі тэорыі з практыкай работы школы. Па яго ініцыятыве былі распрацаваны актуальныя цыклы лекцый, з якімі ён і іншыя члены кафедры неаднаразова выступалі перад настаўнікамі ў школах Мінска і рэспублікі, на курсах, а таксама ў абласным, гарадскім і рэспубліканскім інстытутах удасканалення настаўнікаў. Акрамя таго, кафедра неаднаразова праводзіла сумесныя пасяджэнні з педсаветамі гарадскіх і сельскіх школ, круглыя сталы, прысвечаныя актуальным пытанням навучання і выхавання.

Па ініцыятыве Сцяпана Андрэевіча была арганізавана ва універсітэце самастойная кафедра псіхалогіі. Гэта дазволіла псіхолагам больш увагі сканцэнтраваць на псіхалагічных праблемах.

Шматгранная і актыўная была грамадская дзейнасць С. А. Умрэйкі. Шмат гадоў ён узначальваў Педагагічнае таварыства БССР, якое каардынавала і накіроўвала ўсю метадычную і даследчую работу ў галіне педагогікі сярэдняй і вышэйшай школы ў рэспубліцы. Неаднаразова выбіраўся ён дэлегатам рэспубліканскага і Усесаюзнага з'ездаў настаўнікаў, а таксама прадстаўляў БССР на міжнародных канферэнцыях па праблемах асветы (ЮНЕСКА).

Камуністычная партыя і Савецкі ўрад высока ацанілі баявыя і працоўныя заслугі С. А. Умрэйкі: ён быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам «Знак Пашаны», сямю медалямі і чатырма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР. Яму было прысвоена ганаровае званне заслужанага настаўніка Беларусі. Пастановай Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Песачанскай сярэдняй школе прысвоена імя вядомага земляка — С. А. Умрэйкі. У школе працуе музей яго імя.

Работнікі народнай асветы, калектыў БДУ імя У. І. Леніна, шматлікія вучні і паслядоўнікі Сцяпана Андрэевіча працягваюць яго добрыя справы і са шчырай удзячнасцю успамінаюць яго добрае імя — імя чалавека, які аказаў вялікі ўплыў на развіццё школы і педагагічнай думкі ў Савецкай Беларусі.

В. МЕШЧАРАКОЎ,
дацэнт кафедры педагогікі.

ФАЛЬШ-СТАРТ



*Аб'ява прыкладна з такім зместам з'явілася за пяць дзён да пачатку конкурсу:*

*«Усім падрыхтаваць мастацкую самадзейнасць! У выпадку невыканання вінаватыя не дапускаюцца да зімовай сесіі або будуць адпрацоўваць «свае грахі» на будоўлі».*

# КАМІТЭТ-БАРАБАС

ЗАПАЛОХВАННЕ падсвядома не магло не выклікаць у студэнтаў негатыўныя адносіны да мерапрыемства. Не сказаць, каб перапужаліся першакурснікі, не, нават абурыліся спачатку, хоць... Зрэшты, хто яго ведае?.. Інстынкт самазахавання ўзяў верх над пачуццямі, і студэнты ліхаманкава ўзяліся рыхтаваць праграму конкурсу.

А тут, як на бяду, пасыпаліся і першыя выпрабаванні ў вучобе: то залік, то калоквіум, то семінар. Але і ў конкурсе самадзейнасці ніхто не хацеў выглядаць горш за іншых — гэта ж першы іспыт, першая магчымасць паказаць свае здольнасці, зарэкамендаваць сябе. «Мудрае рашэнне» камітэт камсамола гістфака, мабыць, і было разлічана на «справу гонару». Дастаткова загадаць, а якім чынам усё будзе выканана — клопаты «падначаленых». Проста і на дзіва зручна. І ніякіх табе турбот. «Выканаўцы» ж хоць і спрабавалі ўсёй душой ажыццявіць «намечанае» камітэтам камсамола, аднак грандыёзнага падарунка «кіраўніцтву» не атрымалася. Свята было як на выступленнях тэатра Карабаса-Барабаса. Абыякавыя, інфантыльныя твары «артыстаў» сведчылі аб фармальным падыходзе большасці студэнтаў да конкурсу.

Праўда, зрабіць штосьці цікавае, арыгінальнае за пяць дзён не пад сілу і прафесійным артыстам. Вінаваціць ў гэтым першакурсніка? Дарэчы, нумары «Танец «Яблычка», праграма для мужчын, «Рабі з намі, рабі як мы, рабі лепш за нас», «Жыццё ў інтэрнаце» спадабаліся гледачам. А ў цэлым, свята не атрымалася. Хіба ж гэта цікава, калі артыст выконвае ролю, чытаючы тэкст з паперкі?

Закончыўся конкурс. Журы бадзёрым голасам аб'явіла пераможцаў. Першае месца дасталося палітэканомам, другое — гісторыкам КПСС, трэцяе — IV групе гісторыкаў. Аднак, ці не горкім здаўся пераможцам салодкі прыз? Ці растварыў ён асадак раўнадушша ў сэрцах першакурснікаў?

І. ДУБНІК,
студэнтка факультэта журналістыкі.

НАТАТКІ КАСТРАВОГА

# У ПАХОД ЗА СЯБРОЎСТВАМ

***Адчайныя хлопцы і дзяўчаты з журфака, каб пабачыць горы і мора, знайсці прыгоды на шляху, адправіліся ў вандраванне па Крыму.***

***...Размеркавалі абавязкі. Мяне прызначылі захоўваць вогнішча. Кожны вечар я расказваў аб пражытым дні.***



2.11.88. Даводзілася вам калі-небудзь хадзіць па аблоках? А нам давялося. Праходзячы па краі абрыву, калі пад нагамі нічога не бачыш, кожны раз успамінаеш родны універсітэт. Турысты — дзіўны народ. Гэта ж трэба ісці, ісці і ісці, каб на вяршыні гары паглядзець уніз і амаль спужацца — на якую вышыню ты забраўся!

3.11.88. Пачалося ўсё з таго, што ў час сняданку (мы спыніліся ля вадапада Джур-Джур) каля нас круціўся нейкі сабака. Сяргей Ананіч пажартаваў: «Наш экскурсавод». І, ведаеце, яго словы пацвердзіліся. Калі мы пакінулі месца начлегу, сабака бег наперадзе, дакладна паказваючы кірунак групы.

Кіламетраў пяць ішлі правільна. Паспадзяваўшыся на новага «гіда», мы страцілі пільнасць і сышлі з маршруту. Потым мы здагадаліся, што сабака падвёў нас незнарок. Справа ў тым, што большасць турыстаў ідуць на гару Дзяржынскую, а нам патрэбна было трапіць на Айалексій.

4.11. 88. Была ціхая, зорная ноч. Вогнішча, раскладзенае на беразе мора, і ўсё навокал спрыяла філасофскім разважанням.

Ёсць тры рэчы, на якія чалавек можа глядзець, не адводзячы вачэй — агонь, мора і зорнае неба. Агонь і мора, калі няма ветру, нібы складаюцца са шматлікіх агеньчыкаў і хваль. Яны спакойна гараць і плёскаюцца на ўзбярэжжы. З ветрам усе агеньчыкі нібы ператвараюцца ў адзінае магутнае полымя, страшныя хвалі, якія знішчаюць усё на сваім шляху.

Кожны агеньчык, хваля і зорка — чалавечае жыццё. А каб жыццё пакалення чаго-небудзь каштавала, патрэбна выбраць правільны шлях і ніколі не збочваць з яго.

6.11.88. Праз некалькі гадзін хады мы, нарэшце, апынуліся на вяршыні гары. Нашы вочы загарэліся, калі мы ўбачылі ў даліне вінаграднікі. Але і «другое дыханне» хутка пачало нас падводзіць: не так усё блізка, як здаецца з гары. Пакуль дайшлі да плантацыі, апетыт некалькі разоў паспеў разгарэцца і знікнуць.

7.11.88. Прачнуўшыся 7 лістапада, крыху пашкадавалі, што знаходзімся не ў Мінску. Але адчуванне гэта прайшло, калі мы сталі сведкамі ўнікальнага турысцкага парада.

Вось міма нашай стаянкі на «Зялёнай плошчы» лугу праходзіць калона дэманстрантаў з Масквы, потым — з Днепрапятроўска. І хутка горнае эха не паспявае ўторыць святочнаму «Ура-а-а!», што разнеслася над калонай дэманстрантаў.

8.11.88. Сёння мы зрабілі сапраўднае геаграфічнае адкрыццё. Усе тыя, хто падарожнічае па Крыму, могуць зрабіць на карце адзнаку. У канцы сяла Рыбачае знаходзіцца так званы прытулак Міхайлава. Гэта самы гасцінны дом, які толькі ёсць у Крыму. Тут нас пачаставалі гарачым чаем, а Ігар Адамовіч праспяваў гаспадарам нашы беларускія песні, якія пад акампанемент гітары гучалі вельмі прыгожа.

Так закончылася наша падарожжа. Галоўнае, мы выканалі наш дэвіз: «У паход — за сяброўствам!» Мы сталі не проста студэнтамі аднаго факультэта, а сапраўднымі сябрамі.

А. ШАРПІЛА,
удзельнік паходу.

## СУСТРЭЧА

з членамі таварыства маладых літаратараў «ТУТЭЙШЫЯ» адбудзецца ў актавай зале філалагічнага факультэта 23 снежня а 19-й гадзіне.

А. БАДАК.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
15 снежня.
Зак. 1640.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.